

СКАНВОРД

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Каскад. Сто. Качар. Джэм. Нарыс. Лапа. Удава. Адам. Бок. Ніл. Карэ. Раса. Слуп. Пласт. Сода. Агарак. Молат. Кара. **Па вертыкалі:** Касір. Дрозд. Адна. Атрад. Жолаб. Мацак. Апала. Сум. Ворс. Атэстат. Ікол. Прусак. Апора. Атака. Ауп. Дар.

Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, *г. Мінск.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.39	21.46	17.07
Віцебск —	4.20	21.44	17.24
Магілёў —	4.29	21.36	17.07
Гомель —	4.35	21.23	16.48
Гродна —	4.56	21.59	17.03
Брэст —	5.06	21.50	16.44

Месяц

Маладзік 21 чэрвеня. Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Акуліны, Антаніны, Ганны, Пелагеі, Дзмітрыя, Івана, Савы.*
К. *Дануты, Магдалены, Паўліны, Паўла, Рудольфа, Яна.*

Фота Вікторыі МІРОНЧЫК.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

26 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

1945 год — Беларуская ССР разам з іншымі дзяржавамі антыгітлераўскай кааліцыі — заснавальнікамі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый падпісала Статут ААН (ратыфікаваны Вярхоўным Саветам БССР 30 жніўня 1945 года).

1955 год — нарадзілася Галіна Васілеўна Забур'янава, беларуская спартсменка (плаванне), майстар спорту СССР, суддзя нацыянальнай катэгорыі. Чэмпіёнка першынства СССР (1971), фіналістка Спартакіяды народаў СССР (1975). Прызёр Кубка СССР (1975). Неаднаразовая чэмпіёнка Беларусі і Расіі.

1970 год — нарадзілася Марына Вікенцьеўна Лобач, беларуская спартсменка (мастацкая гімнастыка), заслужаны майстар спорту СССР, суддзя міжнароднай катэгорыі. Абсалютная чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў 1988 года, чэмпіёнка (1987) і сярэбраны прызёр (1985) чэмпіянатаў свету ў асобных відах мнагаборства. Чэмпіёнка Еўропы (1988) і сярэбраны прызёр у асобных відах практыкаванняў.

У свеце

1925 год — нарадзіўся Павел Іванавіч Бяляеў, лётчык-касманаўт СССР, Герой Савецкага Саюза. Камандзір касмічнага карабля-спадарожніка «Узыход-2», з борта якога 18 сакавіка 1965 года лётчык-касманаўт Аляксей Лявонаў здзейсніў першы ў свеце выхад у адкрытую касмічную прастору.

1940 год — Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прыняў Указ «Аб пераходзе на васьмігадзінны рабочы дзень, на сямідзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага сыходу рабочых і служачых з прадпрыемстваў і ўстаноў». Прадугледжвалася павелічэнне працягласці рабочага дня. Забараняўся самавольны пераход рабочых і служачых з аднаго прадпрыемства на іншае, парушальнікі аддаваліся суду і караліся турэмным зняволеннем. Прагул без уважлівай прычыны цягнуў папраўча-працоўныя работы па месцы працы на тэрмін да шасці месяцаў з утрыманнем чвэрці заробку.

1945 год — указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР устаноўлена воінскае званне Генералісімус Савецкага Саюза. На наступны дзень першым і адзіным яго ўладальнікам стаў Іосіф Сталін.

У гэты ж дзень быў заснаваны Міжнародны суд, галоўны судовы орган ААН.

1950 год — нарадзіўся Яак Арнавіч Ёала, савецкі і эстонскі эстрадны спявак. Заслужаны артыст Эстонскай ССР.

1960 год — абвешчана незалежнасць Мадагаскара.

Так гаварыў...

ЛЕЎ ТАЛСТОЙ:

«У таго, хто нічога не робіць, заўжды шмат памагатых».

УСМІХНЕМСЯ

Доктар звычайнай сельскай бальніцы знайшоў цудатворны сродак ад усіх жаночых хвароб — варта сказаць жанчыне, што гэта звычайная прыкмета старасці, і выздараўленне адбываецца проста на вачах...

Фраза доктара: «Да вясельля зажыве!» — моцна здзівіла 80-гадовую бабульку, але запаліла бляск у яе вачах!

— Увечары, ідучы спаць, вам варта пакідаць за дзвярыма ўсе свае непрыемнасці, — раіць псіхатэрапеўт свайму пацыенту.

— І вы думаеце, — кажа пацыент, — што мая жонка пагодзіцца спаць на лесвічнай пляцоўцы?

— Доктар, гэта праўда, што жанчыны жывуць даўжэй за мужчын?

— Ва ўсялякім выпадку, удовы...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1854. Нумар падпісаны ў 19.30 25 чэрвеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12